Установа адукацыі

"Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"

Факультэт Музычнага мастацтва

Кафедра Духавой музыкі

| | |
|---|---|
| УЗГОДНЕНА | УЗГОДНЕНА |
| Загадчык кафедрай | Дэкан факультэта |
| ________________________ | ________________________ |
| ___ ____________2017 г. | ___ ____________2017 г. |

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# ІНСТРУМЕНТАЗНАЎСТВА І ІНСТРУМЕНТОЎКА

для вышэйшых навучальных устаноў па спецыяльнасці
1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках),
напрамку спецыяльнасці 1-18 01 01-02 Народная творчасць
(інструментальная музыка),
спецыялізацыі 1-18 01 01-02 02 Інструментальная музыка духавая

Складальнік
Карацееў А.Л.

Разгледжана і зацверджана
на паседжанні Савета ўніверсітэта
20.16.2017 пратакол № 10

Мінск 2017

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Складальнік:

*Карацееў А.Л., прафесар кафедры духавой музыкі УА "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт*

Рэцэнзенты:

*Кафеда аркестравага дырыжыравання* УА «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі» (*пратакол ад* 25.05.2017 года, № 5);

*Старыкава В.В., дацэнт кафедры народна-інструментальнай творчасці УА "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт*

Разгледжаны і рэкамендаваны да сцвярджэнні:

*Кафедрай духавой музыкі*
*(пратакол ад № 9 ад 27.04.2017)*

*Саветам* факультэта факультэт музычнага мастацтва
*(пратакол ад 02.05.2017 № 8).*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**ЗМЕСТ**

1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА ..........................................................................4-9

2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ: ..............................................................................10-78

2.1 ТЭКСТ ЛЕКЦЫЙ па вучэбнай дысцыпліне “Інструментазнаўства і інструментоўка”……………………………………………………………………...12-72

2.2 Інфармацыйныя рэсурсы БДУКМ па праблематыцы вучэбнай дысцыпліне “Інструментазнаўства і інструментоўка”……………………69-72

3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ: ..............................................................................73-78

3.1 Семінарскія заняткі.

Тэматыка семінарскіх заняткаў і пералік пытанняў………………………74-76

3.2 Вучэбныя выданні для падрыхтоўцы студэнтамі матэрыялаў да семінарскіх заняткаў па вучэбнай дысцыпліне “Інструментазнаўства і інструментоўка”……………………………………………………………………...76-78

4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ ....................................................79-

4.1 Пытанні для самакантролю………………………………………………80

4.2 Заданні для самастойнай працы студэнтаў……………………………81-83

4.3 Практычныя заданні па выкананню самастойнай работы студэнта…………………………………………………………………………………84-85

4.4 Метадычныя указанні па выкананню самастойнай работы студэнтаў.85-86

4.5 Графік кантролю за самастойнай работай студэнтаў…………………..86-87

4.6 Пытанні да экзамена……………………………………………………………..87-89

4.7 Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці і рэкамендацыі па арганізацыі самастойнай працы студэнтаў………………89

5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ ..........................................................................90-104

5.1 Вучэбна-метадычная карта вучэбнай дысцыплины “Інструментазнаўства і інструментоўка”……………….........................................91-92

5.2 Праграма вучэбнай дысцыпліны “Інструментазнаўства і інструментоўка”…………………………………………………………………......93-99

5.3 Асноўная літаратура .........................................................................................99-101

5.4 Дадатковая літаратура ...................................................................................101-104

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне “Інструментазнаўства і інструментоўка” прызначены забяспечыць працэс падрыхтоўкі кадраў для духавога мастацтва. Распрацаваны вучэбна-метадычны комплекс - гэта сукупнасць вучэбна-праграмных, вучэбна-тэарэтычных, вучэбна-практычных і вучэбна-наглядных матэрыялаў, якія аб'яднаны адзінствам аўтарскай задумы і прынцыпамі лагічнай структурнай пабудовы ў адпаведнасьці з навучальнымі планамі і вучэбнай праграмай. Вучэбна-метадычны комплекс вызначаны для забеспячэння якаснага правядзення ўсіх відаў заняткаў па вучэбнайй дысцыпліне “Інструментазнаўства і інструментоўка”.

Падрыхтаваны вучэбна-метадычны комплекс дазваляе фарміраваць ў студэнтаў спецыялізацыі 1-18 01 01-02 02 «Інструментальная музыка духавая» дакладныя веды аб мастацка-выразных, тэхнічна-выканальніцкіх асаблівасцях і спецыфікі функцыянавання духавых і ўдарных аркестравых інструментаў на лепшых узорах музычнага мастацтва на прыкладзе выкарыстання гэтых інструментаў у межах сучасных складах ансамбляў і аркестраў духавых і ўдарных інструментаў.

Вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне “Інструментазнаўства і інструментоўка” з’яўляецца ўзаемаабумоўленным тэарэтычна-практычным і творча-эксперыментальным модулям па засваенню будучымі кіраўнікамі аматарскіх калектываў навуковых, гістарычных ведаў аб спецыфікі эвалюцыі музычнага інструментарыя, яго класіфікацыі, мастацка-тэхнічных і функцыянальных асабліасцях, разціццю творчых навыкаў і уменняў па інструментоўцы музычных твораў для сучасных аркестраў духавых і ударных інструментаў. Уразуменне тэарэтычнага і практычнага матэрыяла, адлюстраванага у вучэбна-метадычным комплексе па вучэбнай дысцыпліне дысцыпліны “Інструментазнаўства і інструментоўка”, дазваляе будучым кіраўнікам аматарскіх духавых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аркестравых і ансамблевых калектываў засвоіць матэрыялы па чытанню і аналізу аркестравых партытур,улічваць класіфікацыю, функцыянальныя і мастацка-выканальніцкія асаблівасці не толькі тыповых, але і эксперыментальных складаў ансамбляў ці аркестраў духавых і ўдарных інструментаў, а таксама вызначаць адпаведныя мастацка-творчыя задачы пры інструментоўке музычных твораў з улікам існуючай практыкі аркестравага і ансамблевага выканаўства.

***Мэта вучэбна-метадычнага комплекса па вучэбнай дысцыпліне "Інструментазнаўства і інструментоўка"*** – забяспечэнне працэса падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў вышэйшай адукацыі, якія здольны выконваць розныя формы інструментовак у адпаведнасці з тым складам аркестра ці ансамбля, з якім яны будуць самастойна працаваць (тыпавыя, а таксама эксперыментальныя склады аркестраў, ансамбляў духавых і ўдарных інструментаў).

***Асноўныя задачы вучэбна-метадычнага комплекса па вучэбнай дысцыпліне "Інструментазнаўства і інструментоўка"*** – атрыманне ведаў па гісторыі эвалюцыі духавога і ўдарнага музычнага інструметарыя і яго тыпалогіі, развіццё асабістых навыкаў, уменняў студэнтаў па інструментоўке рознажанравых музычных твораў для ансамбля, аркестра духавых і ўдарных інструментаў. Вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне "Інструментазнаўства і інструментоўка" ўключае наступныя пытанні:

– класіфікацыя сучасных духавых і ударныхмузычных інструментаў, іх мастацка-выразныя, тэхнічна-выканальніцкія і функцыянальныя асаблівасці;

– дакладнае нотна-графічнае афармленне у кампутарным выглядзе партытуры і асабістых партый выканаўцам ансамбля ці аркестра духавых і ўдарных інструментаў у працэсе стварэння асабістых інструментовак для розных складаў ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў у адпаведнасці з існуючымі патрабаваннямі да выкарыстання аптымальных штрыхоў, традыцыйных і спецыфічных прыёмаў гуказдабывання, жанрава-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стылістычных асаблівасцей з улікам выкладання музычнай фактуры, музычнай драматургіі, прыёмамі інструментоўкі і функцый духавых і ўдарных інструментаў;

– расшыфроўка існуючай спецыяльнай тэрміналогіі музычнага мастацтва, у тым ліку духавога мастацтва.

***Структура*** вучэбна-метадычнага комплекса па вучэбнай дысцыпліне “Інструментазнаўства і інструментоўка” прадугледжвае дыферэнцыяцыю матэрыяла па наступных частках:

1) тэарэтычный матэрыял (інструментазнаўства і тэорыя інструментоўкі), які накіраваны на засваенне студэнтамі асноўных ведаў дысцыпліны “Інструментазнаўства і інструментоўка” на лекцыйных, семінарскіх і практычных занятках;

2) практычна-творчы матэрыял (Інструментоўка твораў для ансамбля, аркестра духавых і ўдарных інструментаў), які спрыяя выкананню асабістых інструментовак студэнтаў пад кіраўніцтвам выкладчыка.

Вучэбны матэрыял вучэбнай дысцыпліны “Інструментазнаўства і інструментоўка” дазваляе студэнтам набываюць практыку напісання варыянтаў інструментовак для розных тыпах складаў ансамбляў (аднаіменны, роднасны, змешаны) ці аркестраў духавых інструментаў (малы медны, вялікі медны, змешаны малы, вялікі змешаны) з магчымым уключэннем эпізадычных музычных інструментаў. Усведамленне студэнтамі тэарэтычнага і практычнага матэрыяла па вучэбнай дысцыпліне “Інструментазнаўства і інструментоўка” цесна звязана з адпаведнымі ведамі па музычна-гістарычных, музычна-тэарэтычных і спецыяльных дысцыплінах: гісторыя мастацтваў, у тым ліку музычнага мастацтва, сальфеджыо, тэорыя музыкі, гармонія, паліфонія, аналіз музычных формаў, аркестравы клас, камерна-інструментальны ансамбль, методыка работы з ансамблем і аркестрам духавых інструментаў, методыка выкладання спецыяльных дысцыплін, чытанне аркестравых партытур і г.д.). У працэсе навучання студэнты павінны ***атрымаць веды*** па наступных пытаннях:



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– гісторыя і тэорыя інструментазнаўства;

– класіфікацыя, функцыянальныя і мастацка-выканальніцкія асаблівасці тыповых і эксперыментальных саставаў ансамбляў ці аркестраў духавых і ударных інструментаў;

– тэорыя інструментоўкі;

– прынцыпы і прыемы інструментоўкі, аранжыроўкі, перакладу, апрацоўкі і іншых форма інструментоўкі;

– сутнасць аркестравага і ансамблевага выканаўства і вызначэнне адпаведных задач у працэсе інструментоўке музычных твораў;

– мастацка-творчыя, арганізацыйна-метадычныя асаблівасці работы па афармленню у кампутарным выглядзе партытур і асабістых партый выканаўцам для ансамбляў ці аркестраў духавых інструментаў;

– этапы работы над інструментоўкай музычных твораў, іх змест і задачы;

– музычная фактура, яе сутнасць, разнастайнасці тыпаў і іх асаблівасці;

– фактура меладычных аркестравых галасоў;

– выкананне розных варыянтаў інструментовак таго ці іншага музычнага твора і яго трактоўка;

– функцыянальныя, мастацка-выразныя, тэхнічна-выканальніцкія магчымасці духавых і ударных інструментаў і спецыфіка іх выкарыстання ў ансамблі ці аркестры розных складаў.

Матэрыялы вучэбна-метадычнага комплекса па вучэбнай дысцыпліне “Інструментазнаўства і інструментоўка” прадугледжваеюць развіццё ў студэнтаў наступных ***уменняў***:

– напісанне асноўных і варыянтных разнастайнасцей інструментовак на тыпавы ці іншы склад ансамбля, аркестра духавых інструментаў;

– дакладнае афармленне партытуры ў адпаведнасці з існуючымі патрабаваннямі;

– адаптаваць партытуру музычнага твора да наяўнага складу аркестра ці ансамбля;

– вызначэнне аптымальнай формы інструментоўкі музычнага твора;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– дасягненне лагічнай пабудовы меладычнага галасавядення, гарманічнага суправаджэння, кантрапункту, фразіроўкі;

– вызначэнне адпаведнага дынаміка-акустычнага балансу гучанні ансамбля аркестравых груп у межах аркестравага калектыву;

– вырашэнне пытанняў па выкананні метрарытмічных цяжкасцей для выканаўцай той ці іншай аркестравай групы і магчымай адаптацыі адпаведнага музычнагаматэрыяла;

– напісанне інструментовак старадаўняй, сучаснай музыкі з улікам жанрава-стылявых асаблівасцей яе выканання ансамблямі, аркестрамі духавых і ўдарных інструментаў.

У адпаведнасці з вучэбным планам, асноўная частка тэарэтычных, практычных і індывідуальных заняткаў па вучэбнай дысцыпліне "Інструментазнаўства і інструментоўка" ажыццяўляецца ў I-II семестры у выглядзе лекцый, семінараў, практычных і індывідуальных заняткаў пры умове вызначэння студэнтамі і выкананні імі заданняў па самастойнай рабоце. На экзаменах і заліках апытанне студэнтаў ажыццяўляецца па тэарэтычных пытаннях (тэрміналогія, сутнасць працэса транспазіцыі, функцыянальныя асаблівасці духавых і ударных інструментаў і г.д.) і практычных заданняў (напісанне партытуры; вызначэнне адпаведнага інтэрвала транспазіцыі для транспануючых інструментаў; чытанне партытуры музычнага твора і аналіз склада ансамбля, аркестра, іх груп ці асобных інструментаў; строй, дыяпазон, мастацка-выразныя і тэнічна-выканальніцкія характарыстыкі гучання ансамбля ці аркестра і ўсіх інструментаў, якія уваходзяць у гэтыя саставы). Адзначым, што ў апошні час у аркестравай літаратуры для духавых аркестрах з'явілася значная колькасць музычных твораў, у якіх кампазітары выкарыстоўваюць сучасныя прыёмы ігры і штрыхі, характэрныя для джазавай і эстраднай музыкі. Улічваючы гэты факт і патрабаваннямі сучаснага развіцця музычнага мастацтва, выкладчыкі інструментазнаўства і інструментоўкі павінны для навучання студэнтаў ўключыць у вучэбны рэпертуар тыя музычныя творы, якія адпавядалі бы



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дадзенай жанравай стылістыцы. Большая частка джазавых і эстрадных твораў выконваецца з выкарыстаннем дадатковых клавішных і ўдарных інструментаў, якія павінны вывучацца студэнтамі па вучэбнай дысцыпліне “Інструментазнаўства і інструментоўка” ў якасці эпізадычных.

Па вувчэбнай дысцыпліне “Інструментазнаўства і інструментоўка” прадугледжваюцца іспыты у выглядзе залікаў, экзаменаў і як выніковы іспыт – напісанне і абарона курсавой работы па інструментоўке музыснага твора ў IX семестры, якая павінна быць прадстаўлена падчас выніковай атэстацыі студэнта на дзяржаўным экзамене.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ *ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ*

***“Інст румент азнаўст ва і інст румент оўка”***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 2.1 ТЭКСТ ЛЕКЦЫЙ

***па вучэбнай дысцыпліне “Інст румент азнаўст ва і інст румент оўка”***

**Тэма 1. “УВОДЗІНЫ. МЭТА, ЗМЕСТ, ЗАДАЧЫ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ “ІНСТРУМЕНТАЗНАЎСТВА І ІНСТРУМЕНТОЎКА” І ЯЕ МЕСЦА Ў ПАДРЫХТОЎЦЫ КІРАЎНІКОЎ АМАТАРСКІХ ДУХАВЫХ АРКЕСТРАВЫХ КАЛЕКТЫВА”**

Асноўныя пытанні па тэме:

1) Мэта вучэбнай дысцыпліны “Інструментазнаўства і інструментоўка” і яе роля ў музычна-тэарэтычнай, творча-практычнай падрыхтоўке будучых кіраўнікоў аматарскіх мастацкіх ансамблевых, аркестравых калектываў духавых і ўдарных інструментаў.

2) Змест вучэбнай дысцыпліны “Інструментазнаўства і інструментоўка”

3) Музычна-тэарэтычныя і творча-практычныя асаблівасці блока “Інструментазнаўства – Інструментоўка” ў прафесійнай падрыхтоўке студэнтаў напрамку спецыяльнасці «*Инструментальная музыка (духавая)”*.

4) Асноўныя віды заняткаў, формы бягучага і выніковага кантролю ведаў па вучэбнай дысцыпліне “Інструментазнаўства і інструментоўка”..

Мэта тэмы:

Вызначэнне месца курса “Інструментазнаўства” ў падрыхтоўцы кіраўнікоў аматарскіх духавых ансамблевых, аркестравых калектываў на сучасным этапе развіцця нацыянальнай мастацкай культуры і духавога мастацтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асноўны тэкст лекцыі:

Сярод розных спецыяльных дысцыплін вучэбная дысцыпліна “Інструментазнаўства і інструментоўка” з’яўляецца адной з асноўных музычна-тэарэтычных дысцыплін у працэсе падрыхтоўкі кадраў для музычнага мастацтва, у тым ліку і адной з яго разнастайнасцей – духавога мастацтва. Падрыхтоўка гэтых спецыялістаў ажыццяўляецца ў двух узроўнях сістэмы адукацыі вучэбных устаноў культуры і мастацтваў Беларусі:

1) сярэднія спецыяльныя навучальныя установы культуры і мастацтваў (музычныя каледжы; каледжы культуры і мастацтваў);

2) вышэйшыя спецыяльныя навучальныя установы культуры і мастацтваў (Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі і яё філіі у абласных цэнтрах; Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў; кафедры музычнага мастацтва ў іншых універсітэтах: Гродненскі дзяржаўны універсітэт, Віцебскі дзяржаўны універсітэт і інш.).

Сярод спецыяльных дысцыплін па падрыхтоўке спецыялістаў духавога мастацтва ў вышэйшых навучальных установах культуры і мастацтваў рэспублікі вучэбнай дысцыпліны “Інструментазнаўства і інструментоўка” спрыяе іх прафесійнаму станаўленню. Асабіста гэта тычіцца выпускнікоў Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі, якія атрымліваюць па жаданні кваліфікацыю “Дырыжор духавога аркестра” і выпускнікоў Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў напрамку спецыяльнасці **18 01 01-02 «*Инструментальная музыка (духавая)”***, якія атрымліваюць кваліфікацыю “Кіраўнік аркестра (ансамбля)”. У сувязі з гэтым **галоўная мэта** вучэбнай дысцыпліны “Інструментазнаўства і інструментоўка” – гэта вывучэнне мастацка-выразных, тэхнічна-выканальніцкіх асаблівасцей духавых і ударных аркестравых інструментаў на лепшых узорах музычнага мастацтва. Гэта спрыяе фарміраванню у студэнтаў разглядаемых спецыяльнасцей дакладных ведаў аб выкарыстанні духавых і ударных аркестравых інструментаў у межах сучасных ансамбляў і аркестраў. Існуе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цэлы шэраг вучэбных і вучэбна-метадычных дапаможнікаў, якія разглядаюць пытанні па інструментазнаўству. Адзначым, напрыклад, навучальны дапаможнік Я.Б. Вілкавіра для музычных вучылішч і кансерваторый [1]. Але, на жаль, у гэтым дапаможніке, як і у іншых, адсутнічае вызначэнне тэрміна “Інструментазнаўства”, і толькі даюцца звесткі аб тых ці іншых інструментах духавога аркестра [1, с. 18-47; 144-176; 244-272]. Як адзначаецца ў дапаможніке “Інструментоўка для духавога аркестра” пад рэдакцыяй заслужанага дзеяча мастацтваў Расіі Б.Т.Кажеўнікава, “в качестве музыкально-теоретической дисциплины инструментовка разделяется на две части: 1) и н с т р у м е н т о в е д е н и е , в котором изучается устройство, а также художественные и технические возможности отдельных инструментов оркестра; 2) собственно и н с т р у м е н т о в к у ( и л и  о р к е с т р о в к у ), посвященную приёмам оркестрового изложения музыкальной ткани, соединению и взаимодействию отдельных инструментов и инструментальных групп» [2, с. 3]. Адзначым, што роля музычна-тэарэтычнага і творча-практычнага блока “Інструментазнаўства – Інструментоўка” ў прафесійнай падрыхтоўке будучых кіраўнікоў аматарскіх мастацкіх ансамблевых, аркестравых калектываў духавых і ударных інструментаў вельмі вялікая і адказная. Уразуменне тэарэтычнага і практычнага матэрыяла вучэбнай дысцыпліны “Інструментазнаўства і інструментоўка” дазваліць будучым дырыжорам прафесійных аркестраў духавых і ударных інструментаў, кіраўнікам аматарскіх духавых аркестравых калектываў самастойна чытать аркестравыя партытуры і развіваць асабістыя навыкі, умення па інструментоўке у адпаведнасці з тым саставам аркестра ці ансамбля, з якім яны будуць самастойна працаваць (тыпавыя, а таксама не тыпавыя склады аркестраў, ансамбляў духавых і ударных інструментаў).

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Інструментазнаўства і інструментоўка” адпаведна сваёй выбранай прафесіі спрыяе набыццю будучымі кіраўнікамі духавых аркестравых калектываў практыкі напісання варыянтаў інструментовак для розных складаў ансамбляў (аднаіменны, роднасны,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

змешаны) ці аркестраў духавых існтументаў (малы медны, вялікі медны, змешаны малы, вялікі змешаны). Усведамленне студэнтамі тэарэтычнага і практычнага матэрыяла па вучэбнай дысцыпліны “Інструментазнаўства і інструментоўка” цесна звязана з адпаведнымі ведамі па музычна-тэарэтычных і спецыяльных дысцыплінах: гісторыя музычнага мастацтва, сальфеджыо, тэорыя музыкі, гармонія, паліфонія, аналіз музычных формаў, аркестравы клас, камерна-інструментальны ансамбль, методыка работы з ансамблем і аркестрам духавых і ўдарных інструментаў, методыка выкладання спецыяльных дысцыплін, чытанне аркестравых партытур і г.д.).

У працэсе навучання студэнты павінны ***атрымаць веды*** па наступных пытаннях:

– класіфікацыя, функцыянальныя і мастацка-выканальніцкія асаблівасці тыповых саставаў ансамбляў ці аркестраў духавых і ударных інструментаў;

– сутнасць аркестрава-ансамблевага выканаўства і вызначэнне адпаведных задач пры інструментоўке музычных твораў;

– мастацка-творчыя, арганізацыйна-метадычныя асаблівасці работы па напісанню партытур для ансамбляў ці аркестраў духавых інструментаў;

– этапы работы над інструментоўкай музычных твораў, іх змест і задачы;

– выкананне варыянтаў інструментовак музычных твораў і іх трактоўка;

– функцыянальныя, мастацка-выразныя, тэхнічна-выканальніцкія магчымасці духавых і ударных інструментаў і спецыфіка іх выкарыстання ў ансамблі ці аркестры розных складаў;

– сацыякультурныя аспекты, асаблівасці арганізацыі канцэртна-выканальніцкай дзейнасці ансамбляў, аркестраў духавых і ўдарных інструментаў і разнастайнасці мастацка-тэматычных груп твораў з улікам сацыяльнай і узроставай катэгорыі слухачоў, на якіх разлічана канцэртная праграма.

Вывучэнне тэарэтычнага і практычнага матэрыяла па вучэбнай дысцыпліне “Інструментазнаўства і інструментоўка” прадугледжвае ***развіццё*** ў студэнтаў наступных ***уменняў***:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– напісанне асноўных і варыянтных разнастайнасцей інструментовак на той ці іншы склад ансамбля, аркестра духавых інструментаў;

– дасягнення лагічнай пабудовы меладычнага галасавядення, гарманічнага суправаджэння, кантрапункту, фразіроўкі;

– вызначэнне адпаведнага дынаміка-акустычнага балансу гучанні ансамбля аркестравых груп у межах аркестравага калектыву;

– вырашэнне пытанняў па выкананні метрарытмічных цяжкасцей для выканаўцай той ці іншай аркестравай групы і магчымай адаптацыі адпаведнага музычнагаматэрыяла;

– чытання партытур незнаёмых твораў (з выкарыстаннем фартэпіяна ці выкананне асабных фрагментаў меладычнага галасавядзення, кантрапункту на сваім базавым духавым інструменце пры умове адпаведнага транспаніровання і неабходнай змены тэсітуры гучання);

– напісання інструментовак старадаўняй, сучаснай музыкі з улікам жанрава-стылявых асаблівасцей яе выканання аркестрамі духавых і ўдарных інструментаў.

У працэсе навучання па вучэбнай дысцыпліне "Інструментазнаўства і інструментоўка" студэнт павінен ***развіць*** наступныя ***навыкі***:

– напісання партытур для розных саставаў аркестраў духавых і ўдарных інструментаў у адпаведнасці з існуючымі штрыхамі, традыцыйнымі і спецыфічнымі прыёмамі гуказдабывання;

– дакладнага афармлення партытуры;

– расшыфроўкі існуючай спецыяльнай тэрміналогіі.

У працэсе засваення ведаў, адпаведных навыкаў і уменняў па вучэбнай дысцыпліне "Інструментазнаўства і інструментоўка", неабходна ўлічваць тот факт, што ў апошні час у аркестравай літаратуры з'явілася значная колькасць музычных твораў, дзе кампазітары выкарыстоўваюць сучасныя прыёмы ігры і штрыхі, характэрныя для джазавай і эстраднай музыкі. У сувязі з гэтымі патрабаваннямі часу і ужывання жанрава-стылявых асаблівасцей у духавой музыцы, падчас вывучэння матэрыялаў па вучэбнай дысцыпліне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

“Інструментазнаўства і інструментоўка” неабходна ўключыць у вучэбны і канцэртны рэпертуар аматарскіх мастацкіх ансамблевых, аркестравых калектываў духавых і ўдарных інструментаў тыя музычныя творы, якія адпавядалі бы дадзенай жанравай стылістыцы. Адзначым, што большая частка джазавых і эстрадных твораў выконваецца з выкарыстаннем дадатковых клавішных і ўдарных інструментаў. Яны павінны вывучацца па вучэбнай дысцыпліне “Інструментазнаўства і інструментоўка” ў якасці эпізадычных.

Сярод асноўных відаў заняткаў, форм бягучага і выніковага кантролю ведаў студэнтаў па вучэбнай дысцыпліны “Інструментазнаўства і інструментоўка” , адзначым наступныя. Згодна з вучэбным планам, асноўная частка тэарэтычных, практычных заняткаў па вучэбнай дысцыпліны “Інструментазнаўства і інструментоўка”, праводзяцца ў I семестры у выглядзе лекцый, семінараў пры умове вызначэння студэнтам і вукананні імі заданняў па самастойнай рабоце. Так, па курсу прадугледжана 24 гадзіны лекцыйных заняткаў для студэнтаў дзённай формы навучання і адпаведна 8 гадзін для студэнтаў завочнай формы навучання. Падчас вывучэння тэарэтычнага і практычнага матэрыяла на лекцыйных занятках будучыя кіраўнікі аматарскіх духавых ансамблевых, аркестравых калектываў маюць магчымасць деталёва пазнаёміцца з функцыянальнымі, мастацка-выразнымі, тэхнічна-выканальніцкімі магчымасцямі духавых і ударных інструментаў і спецыфікай іх выкарыстання ў ансамблі ці аркестры розных складаў. На лекцыйных занятках па вучэбнай дысцыпліне “Інструментазнаўства і інструментоўка” прадугледжваецца і знаёмства з сусветнавядомымі сістэмамі тыпалогіі і класіфікацыі аркесравых духавых і ўдарных музычных інструментаў. Больш падрабязнае вывучэнне матэрыяла па вучэбнай дысцыпліне “Інструментазнаўства і інструментоўка” працягваееца на семінарскіх занятках у аб’ёме 6 вучэбных гадзін для студэнтаў дзённай формы навучання і адпаведна 2 гадзіны для студэнтаў завочнай формы навучання. Акрамя гэтага, будучыя кіраўнікі аматарскіх духавых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ансамблевых, аркестравых калектываў павінны планаваць і самастойную работу па падрыхтоўке да семінарскіх заняткаў і будучага іспыту.

Формай выніковага кантролю ведаў студэнтаў дзённай формы навучання і завочнай формы навучання па вучэбнай дысцыпліне “Інструментазнаўства і інструментоўка” з’яляецца экзамен у канцы першага семестра. На экзамене апытанне студэнтаў ажыццяўляецца па тэарэтычных пытаннях (тэрміналогія, сутнасць працэса транспазіцыі, функцыянальныя асаблівасці духавых і ўдарных інструментаў і г.д.) і практычных заданняў (вызначэнне адпаведнага інтэрвала транспазіцыі для транспануючых інструментаў; чытанне партытуры музычнага твора і аналіз склада аркестра, яго аркестравых груп, асобных інструментаў; строй, дыяпазон, мастацка-выразныя і тэнічна-выканальніцкія характарыстыкі гучання ансамбля, аркестра і ўсіх інструментаў, якія уваходзяць у гэтыя саставы).

***Такім чынам***, вучэбная дысцыпліна “Інструментазнаўства і інструментоўка” з’яўляецца галоўнай для атрымання спецыяльных музычна-тэарэтычных ведаў, практычна-творчых навыкаў і ўменняў.

Неабходна адзначыць і тое, што вучэбнай дысцыпліне “Інструментазнаўства і інструментоўка” ў падрыхтоўцы кіраўнікоў аматарскіх духавых ансамблевых, аркестравых калектываў на сучасным этапе развіцця нацыянальнай і сусветнай мастацкай культуры і духавога мастацтва належыць вялікая роля ў працэсе папулярызацыі музычнага мастацтва сродкамі аркестраў духавых і ўдарных інструментаў.

Літаратура для вывучэння тэмы лекцыі:

1. Вилковир, Е. Практический курс инструментовки для духового оркестра: учеб. пособие /Е. Вилковир; ред. Д.Блюм. – М.: Государственное музыкальное издательство, 1963. – 302 с.

2. Инструментовка для духового оркестра: учеб. пособие /Ред.-составитель Б.Т. Кожевников. – М.: Музыка, 1978. – 278 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асноўныя вывады па тэме лекцыі:

1. Будучыя кіраўнікі аматарскіх духавых ансамблевых, аркестравых калектываў павінны атрымаць трывалыя веды па вучэбнай дысцыпліне "Інструментазнаўства і інструментоўка" з улікам асаблівасцей развіцця нацыянальнай и сусветнай мастацкай культуры і духавога мастацтва на сучасным этапе.

2. Вучэбная дысцыпліна "Інструментазнаўства і інструментоўка" з'яўляецца састаўным у працэсе падрыхтоўкі будучых кіраўнікоў аматарскіх мастацкіх ансамблевых, аркестравых калектываў духавых і ударных інструментаў і атрыманыя музычна-тэарэтычныя веды і практычныя навыкі, уменні павінны выкарыстоўвацца студэнтамі ў працэсе вывучэння і іншых дысцыплін (інструментоўка, дырыжыраванне, методыка работы з аркестрам і ансамблям, чытанне аркестравых партытур і г.д.).

Ключавыя паняцці па тэме лекцыі:

1) інструментазнаўства;
2) модуль "Інструментазнаўства – інструментоўка";
3) музычна-тэарэтычныя веды;
4) практычна-творчыя навыкі і ўменні адаптацыі музычнага матэрыяла.

Пытанні, творчыя заданні для самастойнай працы па тэме лекцыі:

1) Вызначыць мэту вучэбнай дысцыпліны "Інструментазнаўства і інструментоўка" і абгрунтаваць яе ролю ў музычна-тэарэтычнай, творча-практычнай падрыхтоўке будучых кіраўнікоў аматарскіх мастацкіх ансамблевых, аркестравых калектываў духавых і ударных інструментаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2) Выканаць параўнальны аналіз зместу музычна-тэарэтычнага і творча-практычнага ьодуля “Інструментазнаўства – Інструментоўка”.

3) Вызначыць месца вучэбнай дысцыпліны “Інструментазнаўства і інструментоўка” ў падрыхтоўцы кіраўнікоў аматарскіх духавых ансамблевых, аркестравых калектываў.

4) Пералічыць асноўныя віды заняткаў, формы і крітэрыі бягучага і выніковага кантролю ведаў па вучэбнай дысцыпліне “Інструментазнаўства і інструментоўка”.

Літаратура для вывучэння тэмы лекцыі:


1. Вилковир, Е. Практический курс инструментовки для духового оркестра: учеб. пособие /Е. Вилковир; ред. Д.Блюм. – М.: Государственное музыкальное издательство, 1963. – С. 3 – 4.

2. Зудин, Н. Пособие по инструментовке для духового оркестра /Н. Зудин, Б. Кожевников. – М.: ВУВД, 1950. – С. 3 – 6.

3. Инструментовка для духового оркестра: учеб. пособие /Ред.-составитель Б.Т. Кожевников. – М.: Музыка, 1978. – С. 3-4.


## Тэма 2. “ТЭРМІНАЛОГІЯ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ “ІНСТРУМЕНТАЗНАЎСТВА І ІНСТРУМЕНТОЎКА”, НАВУКОВЫЯ МЕТАДЫ ДАСЛЕДВАННЯ, СУВЯЗЬ З ІНШЫМІ НАВУКАМІ І ДЫСЦЫПЛІНАМІ”.

Асноўныя пытанні па тэме:

1) Сутнасць тэрміна “Інструментазнаўства” і яго вызначэнне.

2) Параўнальны аналіз тэрміна “Інструментазнаўства” з тэрмінам “арганалогія”. Іншыя тэрміны вучэбнай дысцыпліны “Інструментазнаўства і інструментоўка”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3) Арганалагічны навуковы метад даследвання ў інструментазнаўстве і яго сутнасць.

4) Музычна-эстэтычны навуковы метад даследвання ў інструментазнаўстве і яго сутнасць.

5) Сувязь і ўзаемаабумоўленасць вучэбнай дысцыпліны "Інструментазнаўства і інструментоўка" з іншымі музычна-тэарэтычнымі дысцыплінамі

Мэта тэмы:

Вызначэнне сутнасці тэрмінаў вучэбнай дысцыпліны "Інструментазнаўства і інструментоўка" і яе вывучэнне з улікам сусветнавядомых навуковых метадаў даследвання эвалюцыі духавога і ударнага музычнага інструментарыя.

Асноўны тэкст лекцыі:

Сутнасць тэрміна "Інструментазнаўства" заключаецца ў тым, што гэты кірунак музыказнаўства дае адказ на пытанні аб усіх якасцях музычнага інструментарыя. Зыходзячы з патрабаванняў да прафесійнага навучання па спецыяльнасці 18 01 01 «Народная творчасць» напрамку 18 01 01-02 «Інструментальная музыка (духавая)", мы павінны разглядзець асаблівасці і якасці духавых і ударных музычных інструментаў з пункту гледжання гісторыі гэтага інструментарыя, а таксама і яго сучаснай мадэрнізацыі і мадіфікацыі, якія дазваляюць пашыраць тэмбрава-каларыстычную палітру і функцыянальныя магчымасці гэтых інструментаў як у камерна-інструментальнай выканальніцкай практыкі. так і на ўзроўні ансамблявага і аркестравага выканальніцтва.

Вывучэнне музычнага інструментарыя на працягу розных гістарычных этапаў мела вельмі важную сацыякультурную значнасць. Развіццё музычнага



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інструментарыя, у тым ліку духавога і ударнага, у гісторыі мастацкай культуры адыграла вельмі істотную ролю. Перш за ўсё, гэта роля у тым, што эвалюцыя духавога і ударнага музычнага інструметарыя дазваляя вывучать і гісторыю музычнага развіцця цівілізацыі, таму што існаванне музычных інструментаў выступае як элемент і матэрыяльнай культуры, а таксама і як элемент духоўнай культуры чалавечства. І, такім чынам, можно адзначыць тое, што з'яўленне тага ці іншага духавога ці ударнага музычнага інструмента ў тую ці іншую гістарычную эпоху выступае як ***падзея-эпізадычная з'ява***, ці павінна разглядацца як ***сацыякультурная з'ява***.

Неабходна пералічыць найбольш значныя прыклады:

1) існаванне інструментаў у першабытнаабшчыннай культуры;

2) адлюстраванне бытавання духавых і ударных музычных інструментаў у шэдэўрах Старажытнага Егіпта;

3) асэнсаванне дыферэнцыяцыі функцый музычных інструментаў у музычным жыцці Месапатаміі;

4) фарміраванне старажытнаіндыскай сістэмы класіфікацыі музычных інструментаў, якая разглядала чатыры групы інструметаў з пункту гледжання канструкцыі інструментаў і спосаба звукаатрымання;

5) фарміраванне старажытнакітайскай сістэмы класіфікацыі музычных інструментаў, якая разглядала восем класаў інструметаў, зыходячы з матэрыялу вырабаў інструментаў (камень, метал – медь, древа, трыснёг, скура, гарбуз, гліна, шоўк).

Сутнасць тэрміна "Інструментазнаўства" і яго параўнальны аналіз з тэрмінам "арганалогія". Вызначэнне тэрмінаў дысцыпліны "Інструментазнаўства". Навуковыя метады даследвання ў інструментазнаўстве (арганалагічны, музычна-эстэтычны). Сувязь інструментазнаўства з іншымі навукамі. Сувязь і ўзаемаабумоўленасць вучэбнай дысцыпліны "Інструментазнаўства і інструментоўка" з іншымі музычна-тэарэтычнымі дысцыплінамі (інструметоўка, гісторыя музычнага мастацтва, сальфеджыо, тэорыя музыкі, гармонія, паліфонія, аналіз



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

музычных формаў, аркестравы клас, камерна-інструментальны ансамбль, методыка работы з ансамблем і аркестрам духавых інструментаў, методыка выкладання спецыяльных дысцыплін, чытанне аркестравых партытур і г.д.).

Асноўныя вывады па тэме лекцыі:

1) Параўнальны аналіз тэрміна "Інструментазнаўства" з тэрмінам "арганалогія" дазваляе высвятліць як змест вучэбнай дысцыпліны "Інструментазнаўства і інструментоўка", так і альтэнатыўныя пункты гледжання на вывучэнне гісторыі духавога і ударнага музычнага інструментарыя.

2) Сусветнавядомыя навуковыя метады даследвання эвалюцыі духавога і ударнага музычнага інструментарыя дазваляюць будучых кіраўнікоў аматарскіх мастацкіх ансамблевых, аркестравых калектываў духавых і ударных інструментаў атрымаць неабходныя музычна-тэарэтычныя веды для абранай спецыяльнасці.

3) Асаблівасці вывучэння вучэбнай дысцыпліны "Інструментазнаўства і інструментоўка" заключаюцца ў тым, што ў гэтым працэсе назіраецца ўзаемаабумоўленасць вучэбнай дысцыпліны "Інструментазнаўства і інструментоўка" з іншымі музычна-тэарэтычнымі дысцыплінамі.

Ключавыя паняцці па тэме лекцыі:

1) "Інструментазнаўства";
2) "арганалогія";
3) арганалагічны і музычна-эстэтычны навуковыя метады даследвання ў інструментазнаўстве;
4) ўзаемаабумоўленасць і ўзаемасувязь вучэбнай дысцыпліны "Інструментазнаўства і інструментоўка" з іншымі музычна-тэарэтычнымі дысцыплінамі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пытанні, творчыя заданні для самастойнай працы па тэме лекцыі:

1) Даць вызначэнне тэрміна “Інструментазнаўства” ;

2) Даць вызначэнне тэрміна “Арганалогія”;

3) Зрабіць параўнальны аналіз тэрміна “Інструментазнаўства” з тэрмінам “арганалогія” і вызначыць яго сутнасць;

4) Зрабіць спіс музычна-тэарэтычных дысцыплін, з якіміназіраецца ўзаемаабумоўленасць і ўзаемасувязь вучэбнай дысцыпліны “Інструментазнаўства і інструментоўка”.

Літаратура для вывучэння тэмы лекцыі:


1. Вилковир, Е. Практический курс инструментовки для духового оркестра: учеб. пособие /Е. Вилковир; ред. Д.Блюм. – М.: Государственное музыкальное издательство, 1963. – С. 3 – 4.

2. Зудин, Н. Пособие по инструментовке для духового оркестра /Н. Зудин, Б. Кожевников. – М.: ВУВД, 1950. – С. 3 – 6.

3. Инструментовка для духового оркестра: учеб. пособие /Ред.-составитель Б.Т. Кожевников. – М.: Музыка, 1978. – С. 3-4.


## Тэма 3. “ДУХАВЫЯ І УДАРНЫЯ ІНСТРУМЕНТЫ: ТЫПАЛОГІЯ, ДЫНАМІКА-АКУСТЫЧНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ, САСТАЎНЫЯ ЧАСТКІ”.

Асноўныя пытанні па тэме:

1) Сутнасць і сістэмы тыпалогіі духавых і ударных музычных інструментаў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2) Вызначэнне асноўных састаўных частак духавых і ударных музычных інструментаў;

3) Дынаміка-акустычныя асаблівасці духавых і ударных музычных інструментаў;

4) Фактары, якія абумоўліваюць тэмбрава-каларыстычную розніцу духавых і ударных музычных інструментаў.

Мэта тэмы:

Вызначэнне асноўнага прынцыпа сістэмы тыпалогіі духавых і ударных музычных інструментаў з улікам іх асноўных састаўных частак, тэмбрава-каларыстычнага гучання, дынаміка-акустычных асаблівасцей.

Асноўны тэкст лекцыі:

Сусветнавядомыя сістэмы класіфікацыі музычных інструментаў і іх сутнасць (старажытнакітайская сістэма Боэцыя, старажытнарымская сістэма Кассіадора, старажытнаіспанская сістэма Ісідора Севільскага, старажытнаарабская сістэма Авіцэны (Ібн Сіна) і інш.; класіфікацыйныя падыходы з мэтай тыпалогіі музычных інструментаў бельгійцаў Франсуа Огюста Геварта і Віктора Шарля Маййона, шведа Тобіаса Юхана Хенріка Норлінда і Эрнста Эмсхаймера, француза Андрэ Шефнера, немца Ганса Гейнца Дрегера і інш.). Сутнасць універсальнай структурнай класіфікацыі музычных інструментаў нямецкіх арганалогаў Курта Закса і Эрыха фон Хорнбастеля. Сістэматызацыя духавых, ударных музычных інструментаў у адпаведнасці з агульнапрынятай класіфікацыяй і іх месца ў сусветнай арганалогіі.

Сучасная класіфікацыя тыпавога традыцыйнага і мадыфіцыраванага інструментарыя, яго функцыі, мастацка-выканальніцкія асаблівасці (чатыры



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

групы музычных інструментаў: 1) ідіафоны; 2) мембранафоны; 3) хардафоны; 4) аэрафоны).

Тыпавыя выканальніцкія формы, у якіх выкарыстоўваюца духавыя інструменты. Спецыфіка уключэння духавых інструментаў ў сучасную выканальніцкую практыку (солнае выканаўства; ансамблевае выканаўства; аркестравае выканаўства).

Асаблівасці інтанавання пры выкананні на духавых інструментах (канструктыўныя і тэхналагічныя недахопы і шляхі іх перaадольвання). Узаемаабумоўленасць дакладнага інтанавання і арганалагічных асаблівасцей.

Спецыфіка і асноўныя віды настройкі духавых інструментаў (*меладычны* ці *гарманічны* віды настройкі – іх сутнасць і асаблівасці тэхналогіі).

Выкарыстанне розных спосабаў настройкі з улікам арганалагічных асабівасцей духавых інструментаў (*пры дапамозе слыху; пры дапамозе тюнэра; па камертону; па гучанню другога інструмента* – фартэпіяна ці якога-небуць беларускага народнага духавога інструмента; *карэкціроўка строя* у працэсе выканання той ці іншай паслядоўнасці інтэрвалаў і г.д. ).

Улік асаблівасцей і спосабаў карэкціроўкі інтанавання духавых інструментах ў працэсе сольнага ці сумеснага выканаўства: 1) прынцып ладатанальнага цягацення; 2) выкарыстанне дадатковай аплікатуры; 3) змяненне параметраў апертуры і амбушура; 4) карэкцыя экспрэсіі выканальніцкага дыхання.

Музычны гук і яго асаблівасці ўспрымання ў гучанні духавых і ударных музычных інструментаў. Асноўныя віды музычнага слыха (*бінаўнарны, абсалютны, стылевы* і інш.).

Галоўныя састаўныя часткі духавых і ударных музычных інструментаў (цела, якое гучыць ці вібратар; гукаутваральнік; рэзанатар і інш.).

Сярод фактараў, якія абумоўліваюць спецыфіку прыёмаў гуказдабывання на духавых інструментах неабходна ведаць наступныя:

1) наяўнасць абертонаў і моц іх гучання;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2) матэрыял, з якога вырабляецца музычны інструмент;
3) таўшчыня ці маса гучашчага цела;
4) спосаб гукаутварэння;
5) велічыня мензуры.

Асноўныя вывады па тэме лекцыі:

1. Працэс эвалюцыі музычнага інструментарыя вывучаўся рознымі даследчыкамі. Вынікам гэтых даследванній з'віліся сусветнавядомыя сістемы класіфікацыі музычных інструментаў (старажытнакітайская, старажытнарымская, старажытнаіспанская, старажытнаарабская сістэма.

2. З мэтай удасканалення вывучэння пытання аб асаблівасцях музычнага інструментарыя з'віліся класіфікацыйныя падыходы тыпалогіі музычных інструментаў бельгійцаў Франсуа Огюста Геварта і Віктора Шарля Маійона, шведа Тобіаса Юхана Хенріка Норлінда і Эрнста Эмсхаймера, француза Андрэ Шефнера, немца Ганса Гейнца Дрегера і інш.

3. Сістэматызацыя духавых, ударных музычных інструментаў стала ажыццяўляцца ў адпаведнасці з агульнапрынятай класіфікацыяй нямецкіх арганалогаў Курта Закса і Эрыха фон Хорнбастеля.

4. Сучасная класіфікацыя тыпавога традыцыйнага і мадыфіцыраванага інструментарыя і вывучэнне яго функцыі, мастацка-выканальніцкія асаблівасці ажыццяўляецца па асноўных чатырох групах музычных інструментаў: 1) ідіафоны; 2) мембранафоны; 3) хардафоны; 4) аэрафоны).

Ключавыя паняцці па тэме лекцыі:

1) функцыі, мастацка-выканальніцкія асаблівасці групы ідіафонаў;



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2) функцыі, мастацка-выканальніцкія асаблівасці групы мембранафонаў;

3) функцыі, мастацка-выканальніцкія асаблівасці групы хардафонаў;

4) функцыі, мастацка-выканальніцкія асаблівасці групы аэрафонаў;

5) асноўныя часткі духавых і ударных музычных інструментаў.

Пытанні, творчыя заданні для самастойнай працы па тэме лекцыі:

1) Пералічыць інструменты і функцыянальныя асаблівасці інструментаў, якія уваходзяць у групу ідіафонаў;

2) Пералічыць інструменты і функцыянальныя асаблівасці інструментаў, якія уваходзяць у групу мембранафонаў;

3) Пералічыць інструменты і функцыянальныя асаблівасці інструментаў, якія уваходзяць у групу хардафонаў;

4) Пералічыць інструменты і функцыянальныя асаблівасці інструментаў, якія уваходзяць у групу аэрафонаў;

5) Пералічыць асноўныя састаўныя часткі духавых і ударных музычных інструментаў.

Літаратура для вывучэння тэмы лекцыі:

1. Инструментовка для духового оркестра: учеб. пособие /Ред.-составитель Б.Т. Кожевников. – М.: Музыка, 1978. – С. 3-5.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 4. “ІНСТРУМЕНТЫ, ЯКІЯ ТРАНСПАНУЮЦЬ: СУТНАСЦЬ, КЛАССІФІКАЦЫЯ, СРОЙ, НАТАЦЫЯ Ў ПРАЦЭСЕ ВЫВУЧЭННЯ ІНСТРУМЕНТАЗНАЎСТВА І ІНСТРУМЕНТОЎКІ”

Асноўныя пытанні па тэме:

1) Сутнасць тэрміна “транспазіцыя”.
2) Сутнасць тэрміна “транспаніраванне”.
3) Сутнасць тэрміна “інтэрвал транспазіцыі”.
4) Сутнасць тэрміна “строй інструмента”.

Мэта тэмы:

Засваенне студэнтамі ведаў па асноўным паняццям такіх тэрмінаў, як “транспазіцыя”, “транспаніраванне”, “інтэрвал транспазіцыі”, “строй інструмента”.

Асноўны тэкст лекцыі:

Сутнасць тэрмінаў “транспазіцыя” і “транспаніраванне” дазваляе павольна вырашать як тэарэтычныя, так і творчыя пытані па інструментазнаўству і інструментоўке музычных твораў. У перакладзе с пазнелатінскай мовы адзначае перанос музычнага твора ў іншую танальнасць. Інструмент, які транспануе – гэта такі музычны інструмент, у якога рэальнае гучанне адрозневаецца ад нотна-графічнай фіксацыі на вызначэнны інтэравал. Гэты інтэрвал – велічыня пастаянная для таго ці іншага інструмента, які транспануе. Такі інтэрвал для кожнага інструмента, які транспануе, мае назву “інтэрвал транспазіцыі”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Натуральны гукарад абертонаў для інструментаў, якія транспануюць, натіруюцца ў танальнацсі C-dur. Для таго, каб прагучал на трубе in B натуральны гук B, неабходна напісаць ноту C. Для таго, каб прагучал на валторне in F натуральны гук F, неабходна напісаць ноту C. Але існуюць і інструменты-выключэнні, якія натіруюцца адпаведна асабістаму гучанню (тэнаровы трамбон in B, тэнарова-басовы трамбон in F з уключонным квартвентелем, малая і вялікая тубы адпаведена in Es i in B.

Узнікненне транпануючай натацы. адносіцца да XVIII стагоддзя, калі на духавых інструментах выканаўцы маглі выконваць амаль толькі тоны іх натуральнага гукараду. Паколькі C-dur з'яўлалася найбольш простай па натацыі танальнасццю, таму і узнікла практыка натацыі у гэтай танальнасці і ўсі партыі духавых музычных інструментаў адпаведна іх натуральнаму строю.

Калі з'явіліся інструменты з клапанным і вентільным прыстасаннем, то з'явілась і магчымасці выконваць музыку, якая была аддалена ад асноўнага строя інструмента, які транспануе. З гэтага часу узнікла пактыка транспануючай натацыі негледзячы на тое, што гэта ўскладняла чытанне партыі інструмента, які транспануе. Гэта было лагчэйшым выканаўцы, які ужо асабіста не павінен быў вызначаць інтэрвал транспазіцыі адносна сайго інструмента.

Дзякуючы транспануючай натацыі, адзін і той самы выканаўца павольна мае магчымасць пераключацца з адной differently розностайнасці інструмента аднага рода на другую, якая адрозніваецца іншым строем, але мае тую самуя аплікатуру (напраклад, пераход з кларнета in A на басовы кларнет in B, ці з кларнета in A на кларнет in B).

Некаторыя кампазітары ў XX стагоддзі ажыццяўлялі намаганні натаціі партый для інструментаў, якія транспануюць, адпаведна іх натуральнаму гучанню. Сярод прадстаўнікоў гытага кірунку – знакамітыя капазітары: Шёнберг, Берг, Вебэрн, Анігер, Пракофьеў і іншыя.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У сучысня час у аркестрах духавых інструментаў выкарыстовываюцца інструменты, якія транспануюць, выключна ў наступных строях: in Es, in B, in F. Класіфікацыя інструментаў, якія транспануюць, ажыццяўляецца адпаведна асаблівасці іх тэсітуры гучання па аналагу ў харавым ці вакальніцтве. Існуе асаблівасць натацыі у ансамблевых, аркестравых партытурах і партыях для кожнага інструмента, якія транспанует.

Асноўныя вывады па тэме лекцыі:

З мэтай кваліфікаванай работы па інструментоўке музычных твораў неабходна засвоіць сунасць такіх спецыяльных тэрмінаў інструментазнайства і інструментовўкі, як "транспазіцыя", "транспаніраванне", "інтэрвал транспазіцыі", "строй інструмента". Гэта дазволіць забяспечыць грунтоўныя веды па тэме "ІНСТРУМЕНТЫ, ЯКІЯ ТРАНСПАНУЮЦЬ: СУТНАСЦЬ, КЛАССІФІКАЦЫЯ, СРОЙ, НАТАЦЫЯ Ў ПРАЦЭСЕ ВЫВУЧЭННЯ ІНСТРУМЕНТАЗНАЎСТВА І ІНСТРУМЕНТОЎКІ", а таксама спрыяе дакладнаму выкананню студэнтамі асабістых заданняў па інструментоўке музычных твораў.

Ключавыя паняцці па тэме лекцыі:

1) "транспазіцыя";
2) "транспаніраванне";
3) "інтэрвал транспазіцыі";
4) "строй інструмента".

Пытанні, творчыя заданні для самастойнай працы па тэме лекцыі:

1) Даць вызначэнне тэрміна "транспазіцыя".

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2) Даць вызначэнне тэрміна “транспаніраванне” і напісаць прыклады па варыянтам транспаніравання музычнага твора (асноўны меладычны фрагмент) з адной танальнасці у другую.

3) Даць вызначэнне тэрміна “інтэрвал транспазіцыі” для розных інструметаў, які транспануюць на секунду, кварту, квінту, вялікую сексту, нону, тэрцдэцыму .

4) Даць вызначэнне тэрміна “строй інструмента” і зрабіць параўнальны аналіз на прыкладзе інструментаў у такіх страях, як in C, in B, in Es, in G, in F.

Літаратура для вывучэння тэмы лекцыі:


1. Инструментовка для духового оркестра: учеб. пособие /Ред.-составитель Б.Т. Кожевников. – М.: Музыка, 1978. – С. 16-19.


## Тэма 5. “ГРУПА ЛАБІЯЛЬНЫХ ІНСТРУМЕНТАЎ: МАСТАЦКА-ВЫКАНАЛЬНІЦКІЯ І ТЭХНІЧНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ”.

Асноўныя пытанні па тэме:

1) гісторыя эвалюцыі інструментаў групы лабіяльных музычных інструментаў;

2) мастацка-выканальніцкія, тэхнічныя асаблівасці інструментаў групы лабіяльных музычных інструментаў;

3) асаблівасці нотна-графічнай натацыі інструментаў групы лабіяльных музычных інструментаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мэта тэмы:

Засвоіць асноўныя веды аб гісторыя эвалюцыі інструментаў групы лабіяльных музычных інструментаў і іх мастацка-выканальніцкіх, тэхнічных асаблівасцях.

Асноўны тэкст лекцыі:

Прадстаўнікі музычныя інструменты групы лабіяльных духавых інструментаў – адні са старажытных інструментаў. Розныя свіскі і продкі флейт, якія былі зроблены з костак жывёл, былі знойдзены у слаях верхняга палеаліту арікьянскага перыяда (каля 28 000 – 25 000 гадо да р. Хр.). Гэтыя знаходкі былі знойдзены у Ішталошке (Венгрыя) і ў Малдове.

Інструменты групы лабіяльных духавых інструментаў прайлі вельмі складаны эвалюцыйны пуць – ад простых свісткоў, так званых паляўнічых манкоў, а таксама зробленых з шкарлупайкі арэха, трыснёговыў флейт, ракавіны, косткі, гліны і г.д. да трыснёговыў флейт, а таксама флейт, зробленых з фарфора, хрусталя, бурштына, якія выкарыстовывалісь у музычнай практыкі XVII-XVIII стагоддзяў. Адзначым, што прадстаўнікі сям'і флейт з разнастайнасці дульцевападобных інструментаў тыпа акарын, выкарыстовываліся індейцамі майя (*гл. фота*).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ



Існуюць наступныя разнастайнасці флейт:

1) падоўжная флейта (да іх адносяцца прамыя узоры флейт: флажалет, флейта Пана, блок-флейта, падвойная ці акордавая флейта, беларуская дудка і дудка-парнёўка);

2) папярочная флейта (найбольш вядомыя звесткі адносяцца да IX века да р. Хр., бытавалі ў Кітаі, Індыі, Этрурыі, Візанціі, а таксама ў славянкіх народаў. У краінах Цэнтральнай Еўропы з'явіліся каля X ці XII века. Назва "флетня" было уключана ў першы беларускі друкаваны слоўнік "Лексіс" Зізанія (1596 г.) і "Лексікон" Бярынды (1627 г.).

Гытыя факты сведчаць аб устойлівым бытаванні інструментаў, якія прадстаўляюць сям'ю флейт на усходнеславянскіх землях. У XVIII стагоддзі флейты былі ў складзе гародненскай капэлы Тызенгаузена.

### *Папярочная флейта*

У эпоху рэнесансу канструкцыя папярочнай флейты мала змянілася. Інструмент меў дыяпазон у дзве з паловай актавы і больш, што пераўзыходзіла дыяпазон большасці блок-флейт таго часу на актаву. Інструмент дазваляў браць усё ноты храматычныя гукарада пры ўмове добрага валодання аплікатуры, якая была даволі складанай. Сярэдні рэгістр гучаў лепш за ўсё. Вядомыя арыгінальныя папярочныя флейты эпохі Рэнесансу захоўваюцца ў музеі Castel Vecchio ў Вероне.

### *Эпоха барока*

Першыя сур'ёзныя змены ў канструкцыю папярочнай флейты ўнесла сям'я Оттетэраў. Жак Марцін Оттетэр падзяліў інструмент на тры часткі: галоўку, цела (з дзірачкамі, якія зачыняліся непасрэдна пальцамі) і калена (на якім як правіла размяшчаўся адзін клапан, часам больш). Пасля большасць папярочных флейт XVIII стагоддзя складаліся з чатырох частак – цела інструмента было падзелена напалову. Жак Марцін Оттетэр таксама змяніў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

свідраванне інструмента на канічнае, каб палепшыць інтанацыю паміж актавы.



Жак Марцін Оттетэр іграе на трёхчастнай флейце

У апошніх дэкадах XVIII стагоддзя да папярочнай флейце дадаюць ўсё больш клапанаў – як правіла ад 4 да 6, і больш. На некаторых інструментах становіцца магчымым браць c1 (да першай актавы) з дапамогай падоўжанага калена і двух дадатковых клапанаў. Важныя новаўвядзенні ў канструкцыю папярочнай флейты таго часу ўнеслі Ёган Іаахім Кванц і Ёган Георг Тромліц.

**Класічны і рамантычны перыяд**

